Pierasyłka apłačana „ryčałtam“.

Цана асобнага нумару 15 гр.

№ 1. Вільня, серада 20 лютага 1929 г. Год III.

РЭДАКЦЫЯ й АДМІНІСТРАЦЫЯ: Вільня, Новы Сьвет, Тургельская 22 кв. 3.

ПАДПІСКА: на год . . . 6 зал. „ паўгоду . . . 3 „ на 3 месяцы . . 1 50 гр. Заграніцу ўдвая даражэй.

НАРОД

ЦАНА АБЕСТАК:
Перад тэкстам . . . . 20 гр.
Сярод тэксту . . . . 25 гр.
і па тэксьце. . . . 15 гр.
за радок дробнага друку.

ОРГАН БЕЛАРУСКАЕ СЯЛЯНСКАЕ ПАРТЫІ.

Выходзе 4 разы у месяц.

Да самадзейнасьці!

Нашая інтэлігенцыя ў вялізарнай большасьці паходзіць з прывыклай да супакойнай працы на зямлі земляробскай гушчы, у шмат меншай меры паходзе яна ад радзімаў, бацькі каторых займалі ўрадовыя службы за Расеі. Абодва гэтыя слаі нашага насяленьня ня прывыклі да працы вольных профэсыяў і пагатове няпрывыклі яны да працы, дзе вымагаецца самастойная прадпрыемлівасьць, ініцыятыва — да асобнай і грамадзкай працы культурна-асьветнай і гаспадарскай, асабліва гандлю. Гэтым адзначаецца й нашая інтэлігенцыя. А тымчасам беларускага гаспадарства няма, у каторым-бы беларускія інтэлігенты маглі займаць урады, а яшчэ доўга прыйдзецца чакаць, пакуль польская ўлада пачне прыймаць Беларусаў на ўрады.

Дык самадзейнасьць асьветнаю й гаспадарскаю мы мусім вытварыць у сябе. Ад гэтага залежа цяперака доля беларускага руху і доля беларускага народу ў Заходняй Беларусі.

Гляньма на Жыдоў! Да іх адносіны польскай улады мала лепшыя, як да нас, Беларусаў, а тымчасам дзякуючы сваёй прадпрыемлівасьці, свайму прамыслу і, асабліва, гандлю, яны жывуць нішто, прынамся шмат лепей за нас, нягледзячы на тое, што ня маюць собскай зямлі. Мы, Беларусы ўрадовых школаў можна сказаць ня маем, бо нам іх не даюць. Ня маюць урадовых пачатковых школаў і Жыды, але яны маюць мноства сваіх прыватных школаў, так што ўсе жыдоўскія дзеці могуць вучыцца ў сваіх школах. Нягледзячы на вашаю беднасьць, маглі-б і мы, Беларусы, гэтага дапяць, каб толькі ўсе ў нас зразумелі канечную патрэбу вучыць дзеці ў роднай школе ды завінуліся каля гэтага. Апрача школы, можна вучыць дзеці пабеларуску групамі; гэта нікому не забаронена. У кожнай сям'і бацькі павінны парупіцца, каб іхнія дзеці канечне навучыліся пабеларуску прынамся чытаць і пісаць.

Патрэбна яшчэ зашкольная культурна-асьветная праца грамадзкая—культурна-асьветныя й гаспадарскія Т-вы Беларускага Гаспадарскага Зьвязу і інш., аматарскія тэатры, лекцыі, гутаркі.

Другой вялізарнай галіною дзейнасьці была-б праца гаспадарская—земляробскі прамысл, арганізаваны супольнымі сіламі, коопэрацыя, фірмовыя гандлёвыя супалкі або й зусім звычайны гандаль.

Трэба, каб уся нашая, асабліва безработная, інтэлігенцыя й паўінтэлігенцыя знайшла сабе ў гэтых дзьвюх галінах дзейнасьці ды, ствараючы лепшаю будучыню свайму народу, разам з гэтым забясьпечыла-б будучыню свайму народу, разам з гэтым забясьпечыла-б будучыню й сабе. А разам з інтэлігенцыяй узварухнецца і прыйме ўчасьце ў будаваньню свае культуры й гаспадаркі і ўвесь народ.

Максім Прынскі.

Зь Беларускага Гаспадарскага Зьвязу.

Лекцыі ў Таварыствах Зьвязу.

У хуткім часе старшыня Б. Г. Зьвязу інжынер М. Гузоўскі аб'едзе Таварыствы Б. Г. Зьвязу: Ашмянскага, Валожынскага й Маладачанскага паветаў, гдзе прачытае цыкль лекцыяў з гаспадарскае галіны. Падробна аб дню й тэме лекцыяў кожнае Таварыства будзе павядомлена асобне.

Новае Таварыства Б. Г. Зьвязу.

Дня 30 сьнежня 28 г. заложана новае Таварыства Б. Г. Зьвязу ў вёсцы Вялікае Сяло, Маладачанской вол. і пав. Урад Т-ва наступны: старшыня—Янка Татун, скарбнік—Юльльян Наваш, сэкрэтар—Мікалай Татун, заступнікі да Ураду—Станкевіч Міхал, Рухля Амільян і Чарнецкі Янка.

Новы коопэратыў (сябрына) Б. Г. Зьвязу.

Дня 30 сьнежня 1928 г. у в. Вялікае Сяло, Маладэчанскае вол. і пав. закладзены спажывецкі коопэратыў Б. Г. Зьвязу „Вялікая Зорка“.

Агітатары чорнае сотні ў сьвяшчэніцкай расе.

Агітатары чорнае сотні пачалі праводзіць сваю ганебную працу сярод беларускага народу. Каб зусім забіць у тым народзе яго беларускі дух, яны пачалі ўсякімі шляхамі праходзіць у Віленскаю Духоўнаю Кансысторыю ва месцы сяброў кансысторыі, дзеляваў, а таксама і благачынных, якія хочуць зрусафікаваць нашаю веру й царкву. Спачатку гэтыя агітатары чорнае сотні стараліся заслужыць давер'е народу, а пасьля мала-памалу пачалі сваю Каінскаю працу.

Падчас выбараў у Сойм і Сэнат гэтыя чарнасоценцы адразу-ж пачалі агітаваць за расейскаю партыю Р. Н. О.

Такімі чарнасоценцамі ў сьвяшчэньніцкай расе зьяўляюцца паміж іншымі сябры Віленскай Кансысторыі прот. М. Кушнёў і прот. Васілеўскі. Той хто агітуе за матушку Расію, хаця-ж і ў расе, ёсьць непрыяцелям беларускага народу і агентам тых вузкалобых, недалёкіх палітыкаў „адзінае й недзялімае матушкі Расіі“. Народ гэта зразумеў і стараецца вызваліцца з пад апекі Кушнёвых і Васілеўскіх і ўжо робіць да гэтага адпаведныя крокі. Кушнёў езьдзіць па таких-жа чарнасоценцах як і сам і зьбірае нейкія подпісы проці Беларусаў.

Праваслаўны Беларус.

НАВІНЫ.

— *11-ыя ўгодкі незалежнасьці Літвы* сьвяткавала літоўскае грамадзянства ў Вільні 16-га лютага. На сьвята былі запрошаны і прадстаўнікі беларускага грамадзянства, з каторых прамаўлялі пас. А. Стэповіч, пас. д-р. Я. Станкевіч і Я. Шутавіч (апошні ад студэнтаў). Падаем прамову пас. д-ра Я. Станкевіча: „Паважаныя панове й грамадзяне, ад Бел. Сялянскае Партыі маю гонар прывітаць Вас у 11-ыя ўгодкі незалежнасьці Літвы. Нас, Беларусаў, лучыць зь Ліцьвінамі ня толькі спрадвечнае суседзтва, але й даўгія вякі супольнага палітычнага жыцьця, даўгія вякі мы былі сугрмадзянамі і палітычнымі сябрамі. Дзеля таго пры будаваньню літоўскага гаспадарства ня было Беларуса, каторы-бы з гэтага ня цешыўся. Мы спадзяемся, што з часам паміж беларускім і літоўскім народамі настане ізноў ідэйна-палітычнае сяброўства. Дык мне асабліва прыемна пажадаць вам удачаў у вашым, так блізкім і дарагім нам, гаспадарсьцьвенным жыцьцю“.

— **Kalendaryk, Chryścianskaj dumki.** Пад такім назовам выйшаў з друку малеўкі каталіцкі календарык у беларускай мове. Календарык надрукаваны лацінскімі літарамі, мае 64 стар. малога фармату. Цана календарыка 60 грашоў. Апрацаваў і выдаў календарык ідэйны й рухлівы ў беларускім руху кс. П. Татарыновіч.

Хто ўмее чытаць кірыліцай („рускімі“ літарамі) таму найляпей будзе купіць багаты й вялікі Беларускі Народны Календар (цана 1 зал. 10 гр.), але хто ўмее чытаць толькі лацінскімі літарамі, таму радзім купіць Kalendaryk Chryścianskaj Dumki“.

— **Z majho wakonca.** Вышла кніжка вершаў Ст. Станкевіча пад назовам „Z majho wakonca“, выданьне Я. Гапановіча, стар. 64 у 16°.

Із Заходняй Беларусі.

Суд над 35-ма Беларусамі ў Беластоку.

14 лютага кончыўся ў Варшаве апэляцыйны суд над 35-ма Беларусамі, абвінавачанымі ў належнасьці да комуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Гэтыя 35 чал. былі арыштаваны зь іншымі, разам 133 чал. Увясну 1928 г. быў над імі акружны суд у Беластоку. Апэлявалі толькі засуджаныя на 5—8 год цяжкой турмы.

Апэляцыйны суд 17-ём абвінавачаным зацьвердзіў прысуд акружнога суду, а 16-ём зьменшыў кару, пры гэтым некаторым зь іх на аснове амністыі даравау зусім кару і звольніў з турмы.

Апэляцыйны суд „Грамады“.

Апэляцыйны суд над „Грамадой“ будзе 28 лютага ў Вільні. Падсудныя не абавязаны быць на судзе і дзеля таго могуць прыехаць толькі на свой кошт. Беларускае грамадзянства спадзяецца, што „Грамадаўцы“ будуць апраўданы.

ЛІСТЫ.

Рэлігійны фанатызм.

Сольская парахвія, Ашмянскага пав.

Мінулі ўжо і на нашых землях тыя смутныя часы рэлігійнае барацьбы, узаемнае, паўстаўлай на грунтце розных рэлігіяў, ненавісьці і дзікога фанатызму, калі чалавек аднае рэлігіі, ад душы ненавідзеў чалавека другой рэлігіі. Нашая Сольская парахвія ёсьць у шмат горшым палажэньні чымся суседнія ваколіцы, да нас радка калі трапляе зерня беларускае сьвядомасьці, а навакол пануе адвечная цемра. Пры гэтым яшчэ й нашая інтэлігенцыя, як напрыклад наш сольскі пробаршч, кс. Курпіч заместа таго, каб стаць на варце ўсестароньняга адраджэньня сваіх парахвіян, ён стараецца ўсімі спосабамі захаваць дагэтулешнія адносіны. Ён навет стараецца вытварыць сярод насяленьня розных рэлігіяў. І вось, калі ў маі летась адна дзяўчына зь вёскі Кушляны выйшла замуж за старавера ў вёску Слабада, то наш ксёндз натолькі абурыўся, што ўсёй вёсцы Кушлянам загадаў праз цэлы месяц насіць жалобу, а на памятку гэтага „смутнага“ здарэньня загадаў яшчэ ў вёсцы Кушлянах паставіць крыж.

Вось бачым якія паступкі кс. Курпіча, каторы заместа таго, каб пашыраць узаемную любоў сярод усяго народу, каб лучыць усіх людзей, хоць яны розьняцца рэлігіяй, ён падбурае сваіх парахвіян да дзікой ненавісьці аднаго проці другога і яшчэ за кожнаю непаслушнасьць страша пеклам.

Вось да чаго дайшоў наш ксёндз, каб пастав...

гэтак нізка рэлігію, зрабіць яе аружжам барацьбы, а забыўся, мусіць, што Хрыстос сказаў любіць і свайго непрыяцеля. Але народ наш хаця й слухае падобных дурных загадаў свайго пробаршча, але зь імі ані троха не згаджаецца і прыйдзе такі час, калі народ цалком зразумее істоту рэлігіі і яе ролю ў узаемаадносінах сярод усяго народу і тагды хіба ня будзе слухаць падобных дурных загадаў свайго пробаршча.

Сольскі парахвіянін.

На пошце нішчуць беларускія газэты.

м. Крэва, Ашмянскага пав.

Зь сёлетняй восені прыслалі нам у Крэва новаю кіраўніцу пошты, ды такую нягодваю, што ад часу яе ўрадаваньня беларускіх газэтаў на пошце нам і ня пытайся. „Niema“ — адказуе. Пасьля даўгога надавер'я нашыя сяляне і запраўды паверылі, што газэты ня прыходзяць. Аднак апошнім часам выкрылася запраўднае абліччa нашае паштаркі, дзякуючы ніжэй менаваным фактам.

Аднойчы, калі адзін селянін зь вёскі Арляняты стаяў пад вакном крэўскае пошты і чакаў, каб папытаць, ці ёсьць беларускія газэты, то пачуў як камэндант крэўскае паліцыі раіў паштарцы не аддаваць падпішчыкам беларускіх газэтаў, а тая яму адказала, што „gazety białoruskie wszystkie idą do pieca“. Гэта словы, а вось і пацьвярджэньне іх на практыцы: 16. XII. 28 г. калі двух падпішчыкаў беларускіх газэтаў зьвярнуліся на пошту з пытаньням, ці ёсьць беларускія газэты, то паштарка як і заўсёды, адказала звычайнай сваёй фразай „niema“, а адначасна наймітка паштарчына падпалявала печ беларускімі газэтамі, каторыя брала з поўна напханай скрынкі, куды як відаць, ішлі ўсе беларускія газэты, заместа даручаць іх падпішчыкам. Падобныя нягодныя адносіны крэўскае пошты да беларускае прэсы выклікала агульнае абурэньне ў навакольнага насяленьня. Гэтыя праступкі паштаркі ня будуць ёй даравaны, бо справа ськівавана да Дырэкцыі Поштаў і Тэлеграфаў у Вільні, і мы думаем, што крэўская паштарка будзе пакарана. А ўсім падпішчыкам і чытаром беларускіх газэтаў радзім станоўка дамагацпа беларускіх газэтаў на крэўскай пошце, бо яны высылаюцца туды акуратна.

Крэўскі.

Культура на сяле пашыраецца.

в. Арляняты, Ашмянскага пав.

Вёска Арляняты і навакольныя вёскі на толькі ў шчасьлівым палажэньню, што ўсе праявы беларускага руху даходзяць сюды заўсёды і знаходзяць шчыры водгалас у нашым сялянстве. Гэта ўсё дзеіцца пры помачы выхаджэнцаў з нашае вёскі, што, будучы працаўнікамі на беларускай ніве, прыяжджаючы ў нашаю мясцовасьць, стараюцца ўсімі спосабамі пазнаёміць тутэйшы народ з праявамі беларускага руху, ды павясьці гэты народ па шляху Адраджэньня. Ад некулькі год у нас ужо з добрай удачаю гуляюць беларускія спэктаклі і адным словам вядзецца культурна-асьветная праца.

Апошняй праявай, культурнае працы ў нашай мясцовасьці былі наладжаны на калядныя сьвяты студэнтам Ст. Станкевічам некалькі лекцыеў зь Беларускага жыцьця. На лекцыі прыходзіла вялікая грамада народу, якая з глыбокім зацікаўленьням слухала аб тых няведамых пытаньнях беларускага жыцьця, што перад ёю адкрываў лектар.

Сяляне зацікаўленыя лекцыямі з беларускага руху прасілі Ст. Станкевіча, каб заўсёды, прыяжджаючы на сьвята ў сваю вёску, арганізаваў падобные лекцыі.

Падобныя-ж лекцыі былі прачытаны і ў іншых суседніх мясцовасьцях між іншым і ў в. Пятровічах, Гальшанскае воласьці. У вёсцы Пятровічах ужо некаторы час беларуская сьвядомасьць пераважае. Але побач з гэтым існуе ў гэтай-жа вёсцы і так званае „Koło Młodzieży Wiejskiej“, сябры каторага, выгадаваныя ў цемры і ўзаемнае ненавісьці заместа якой колечы культурнае працы, б'юць адныя адным вокны і яны ёсьць наагул нягоднай часткай гэтае вёскі. І вось калі дня 29, XII. 28 г. зьявіўся гр, Станкевіч і пачаў чытаць лекцыю на тэму: „Галоўныя мамэнты беларускага адраджэньня“,—то вышменаваныя пачалі шумець. Калі-ж некаторыя ўзяліся іх супакоіваць, то на'т паліцыянт сказаў іх не чапаць, падзьдзержуючы гэтым самым хуліганства. Аднак яны самі супакоіліся, бачучы, што гэтым ані чуць не перашкодзяць у чытаньні лекцыі. Гэта адзін з тых многіх яшчэ ў нас цяпер здарэньнеў, як вынік адвечнае цемры на вёсцы і лёгкай безадпорнай паддаўкасьці чужым уплывам, калі тыя, дзеля дабра якіх людзі ахвярна працуюць, падстаўляюць гэтым людзём нагу. Аднак з кожным днём сьвядомая частка насяленьня бярэ сваю перавагу і ў такіх глухіх вёсках, як і менаваныя Пятровічы і няма сумлеву, што за гэтай часткай насяленьня будзе перамога.

тутэйшы.

Войт карае вёску.

в. Руда Яварская, Слонімскага пав.

Праўда вочы коле—кажа прыказка. І гэта тыкі праўда. Пётра Гародка, войт нашай Казлавецкай вол., любе пажывіцца спосабам нягодным і недазволеным. Гэтак ён сёлета налажыў грашавую кару на гаспадароў, што сеялі тытун (табаку). Кара гэтая была даравана амністыяй, але войт гэтага не сказаў гаспадаром і грошы ў іх спагнаў, прысвоіўшы іх сабе. Ашуканства гэтае выкрылі гаспадары зь в. Руда Яварская і войт ледзь не зьляцеў з войтаўства. За гэта ён пастанавіў відавочна памсьціцца на Рудзе Яварскай.

Магчымасьць пазбавіцца Яварскіх Рудаўцаў здарылася борзда. Слонімскае староства хоча некалькі вёскаў Казлавецкай воласьці прылучыць да вол. Курылавіцкай, каб гэткім парадкам зраўняць іх. І вось нягледзячы на тое, што ад Руды Яварскай на 10 вёрстаў далей да Курылавічаў чымся да Казлоўшчыны і ў Курылавічах яны ніколі ня бываюць, войт задумаў прылучыць яе да вол. Курылавіцкай. Каб дапяць гэтага, прыехаў у Руду Яварскаю тады, калі тамака былі блізу што адны жанчыны, і пастрашаньнямі пачаў іх прынукаць падпісацца пад заяваю, што быццам яны хочуць належыць да Курылавіцкай вол. Калі гэта не памагло, войт тымі-ж пастрашаньнямі змусіў іх падпісацца быццам пад накшай заявай, у каторай—казаў ён—ёсьць толькі напісана, што яны слухалі ягонае, войтава, паведамленьне аб патрэбе прылучыцца да Курылавіцкай вол. Аказалася потым, што на тэй паперы было не паведамленьне, але просьба аб прылучэньню. Гаспадары з Руды Яварскай падалі старасту заяву, просячы, каб іх ня прылучалі да Курылавіцкай вол. Мінуў ужо месяц, а адказу ад старасты, на іхняю заяву няма.

Нягож староства ня прыйме пад увагу гэтае разумнае зычэньне Яварскай Руды і згодзіцца на пропазыцыю круцяля-войта?

Гаспадар.

Із Сойму і Сэнату.

Буджэт.

Просьле некалькіх месяцаў разгляду, напасьледак, Сойм у трэйцім чытаньню буджэт прыняў.

Прыбыткі 2 мільярды 962 міл. 595 тыс. 943 залатых.

Выдаткі 2 мільлярды 763 міл. 214 тыс. 41 залат.

Буджэт міністэрства Заграцічных Справаў прыняты бязь зьменаў.

Пропозыцыя ўраду аб зьменшаньні маемаснага падатку на 25 міл. адкінена. Таксама адкінена пропозыцыя ўраду аб павялічэньню на 2 міл. зал. табачных вырабаў.

Дыспозыцыйны фонд 6 міл. міністру Нутраных Справаў ня прызнаны.

За буджэт галасавалі. Беспартыйны Блёк Супрацаўніцтва з Урадам, Хрысьцянская Дэмокрацыя, Былая Рэволюцыйная Фракцыя П. П. С. і „Вызваленьне“. Проці буджэту галасавалі нацыянальныя меншасьці і „Stronnictwo Chłopskie“. Узьдзер-

Ул. Ст. РЭИМОНТ.

АБАРОНА ЗЯМЛІ

(Глянь № 20 „Нмроду“ з 1928 г.).

— Ся хлопцы!—пачаў важна Рыгор.—Я казаў вам што Падлесьсе яшчэ не прададзена Немцам, але абы дзень могуць паехаці рабіць умову і навет казалі, што паедуць у будучы чэцьвер.

— Але-ж ведаем гэта і трэба гэтаму перашкодзіць!—закрычэў нецярпліва Мацей.

— Радзь, Рыгору: ты па кніжцы й газэту чытаеш—табе лягчэй.

— Бо як Немцы купяць і засядуць ля мяжы, дык будзе як у Горках: проста паветра ня станедыхаць, у Ліпцах і старцаваць пойдзем або ў Амэрыку.

— А бацькі толькі патыліцы дзяруць, уздыхаюць а зрабіць нічога ня могуць.

— І з гаспадаркаў нам ня ўступаць!—крычэлі адзін за адным.

— Вялікая важнасьць Немцы! сядзелі таксама ў Лішках, а нашыя ўсю чыста зямлю ў іх выкупілі, а што ў Горках было вачай, дык вінвы самі мужыкі: пілі, прававаліся заўсёды і старэцкія хатулі сабе дасталі.

— Дык і ў Падлесьсю можам выкупіць і прагнаць!—крычэў Андрэй Барына, зродны брат Антонаў.

— Думаеш так лёгка выкупіць: цяпер нямашака за што купіць, хоць толькі на шэсьцьдзесят рублёў за морг хочуць, а потым, дык знайдзем якіх тысяча злотых за тое самае?..

— Каб бацькі выдзелілі кожнаму, што ягонае, дык барджэй справіліся-б.

— Няго-ж! Як-га ведаў-бы што рабіць!—заверашчэлі.

— Ой дурныя, дурныя! Гэта-ж бацькі на цэлай гаспадарцы ледзь пражывуць, а вы на частках хочаце разбагацець! перабіў іх Рыгор.

Адразу змоўклі, бо такую праўду сказаў, як абухом выцяў.

— Ня дзеля таго бяда, што бацькі ня хочуць вам аддаць гаспадарак—казаў далей—а дзеля таго,што у Ліпцах зямлі мала, што народу ўсё прыбывае, што было дзядом на траіх, трэба цяпер падзяліць на дзесяцёх.

— Сьвятая праўда! Ведама што так! Але!—шапталі заклапочаныя.

— Дык купіць Падлесьсе і падзяліць!—вырвалася ў кагось.

— Купіў-бы сяло ды грошы мало!—буркнуў Мацей.

— Адно пачакайце, мо' й на гэта знайдзецца якая рада.

Мацей раптам зарваўся, стукнуў кулаком у стол і закрычаў:—чакайце й рабеце сабе што хочаце, мне ўжо даволі а як зазлуюся, дык кіну сяло і ў места пайду, там ляпей людзі жывуць.

— Тваё дзела, але іншыя мусяць тут аставацца і неяк жыць.

— Бо я ўжо вытрываць не магу, так злосьць забірае: цесна ўсюды, ажно сьцены ледзь не разваляцца, гэтулькі ў іх сядзіць, бяда ажно пішчыць, а тут побач ляжыць вольная зямля і просіцца, каб яе ўзяць... а ня ўгрызеш, хоцьбы здыхэў з голаду, няма за што яе купіць і пазычыць няма ў каго. Каб іх немач із гэт'кімі парадкамі!

Рыгор расказаў, як ё ў іншых краёх.

Слухалі, уздыхаючы жаласьне, а Мацей яго перабіў:

— Што нам із таго, што ў людзёў добра! Смачныя абаранкі з малаком, але пані іх есьць! Добра заграніцай: калі тамака ё апека над народам, ня так як у нас, дзе кожны сялак расьце, як тая дзічка ў чыстым полю, ці ссохне, ці вырасьце—нікому не баліць; абы адно падаткі плаціў, у маскалі йшоў і ўрадам не працівіўся. У горле мне ўжо стаіць гэт'кае жыцьцё...

Рыгор, выслухаўшы цярпліве, ізноў пачаў сваё:

— Ё толькі адзін спосаб, каб Падлесьсе было нашае.

Прысунуліся да яго бліжэй, каб усенька чуць.

Рыгор пачаў выясьняць свой спосаб, што быў

жыліся ад галасаваньня: эндэкі, „Пяст“ і Пол. Пар. Соцыял.

Сэнат. Буджэтная комісыя сэнату вярнула дагэтуль блізу што ўсе соймавыя папраўкі, значыцца сэнацкая комісыя падзьдзержуе буджэт прапанаваны Урадам. Дык яшчэ няма пэўнасьці, як будзе канчальна выглядаць сёлетні буджэт.

Проект констытуцыі Б. Б.

Беспартыйны Блёк Супрацаўніцтва з Урадам падаў у Сойме свой проект новай констытуцыі.

Паводле гэнага проекту права выбіраць паслоў мелі-б грамадзяне, што скончылі 24 гады. Права выбіраць паслоў, сэнатароў і прэзыдэнта мелі-б таксама заўсёдныя вайскавыя (афіцэры й падафіцэры). Паслы маглі-б быць пазбаўлены свайго мандата, калі-б Найвышшы Трыбунал прызнаў іх захаваньне неадпавядаючым дастаенству пасла. У спрэчным выпадку аб важнасьці выбараў пастанаўляў бы прэзыдэнт. Прэзыдэнт выбіраўся-б усім народам з двух кандыдатаў, з каторых аднаго выстаўляў-бы ўступаючы сойм і сэнат разам, а другога ўступаючы прэзыдэнт.

Сэнат складаўся-б із 150 чал., з каторых 50 былі-б назначаны прэзыдэнтам.

Першы славянскі з'езд філёлёгаў у Чэхаславаччыне.

У сотыя ўгодкі сьмерці Язэпа Даброўскага (Józef Dabrovsky) мае адбыцца з'езд славянскіх філёлёгаў, ад усіх славянскіх народаў. З'езд, паводле згоды чэхаславацкае ўлады, адбудзецца 6—13 кастрычніка 1929 году ў Празэ. Ужо падрыхтаваўчая праца пачалася. У камісыі працуюць галоўным чынам славістыя чэска-пражскага унівэрсытэту: праф.: д-р. І. Горак, праф. д-р. Мурко. Падрыхтаваўчая камісыя з мейсцам сталага пабыту ў Празе (Praha V, Brehova ul. č 5, Slovensky Seminar), прапануе учаснікам, каб на з'ездзе рэфэраты прамоўлены былі ў рамках наступных трох аддзелаў:

1. Лінгвістыка славянская.
2. Гісторыя славянскіх літэратураў.
3. Этнографія з ухілам у народнаю славеснасьць.

Падрыхтаваўчая камісыя ўжо разаслала паведамленьні і запрошаньні, між каторымі ёсьць запрошаньне Беларускай Акадэміі Навук у Менску і паасобным беларускім філёлёгам.

З тых хто гэтага запрошаньня не атрымаў мусіць зьвярнуцца да 15. III. 1929 з паданьнем атрымаць удзел і назоў рэфэрату. Рэзумэ можа быць заслана да 1. V. 1929.

Трэба думаць што й Заходняя Беларусь будзе заступлена на з'ездзе побач з Усходняй Беларусьсю.

Філёлёг.

Такі дабіліся роднай школы.

Пасьля даўгога стараньня Беларускаму Гаспадарскаму Зьвязу такі ўдалося дабіцца прыватнай беларускай школы ў в. Панізьзе. (Валожынскі абвод) Валожынскага пав. Вучыцелям зацьверджаны Міхал Шакун. Заняткі пачаліся зь лютага месяца. 14 лютага было каля 40 вучнеў, цяпер іх, пэўне, ёсьць шмат балей. Інспэктар Валожынскага пав., Ставовы, будучы злосным праціўнікам беларускіх школаў, не перастаў ходацца зь беларускаю школаю і пасьля яе адчыненьня. Гэтак ён зусім бясправўна не хацеў зацьвердзіць другога вучыцеля у школу, бо быццам у ваднаклясна школе ня можа быць балей аднаго вучыцеля. Так сама бясправўны быў вусны загад таго-ж інспэктара, каб у школу ня прыймаць балей, як 48 дзяцей, ды каб ня прыймаць дзяцей із польскіх школаў, у каторыя прытым-жа дзеці былі загнаты прывукаю пад страхам кары, тады як школы беларускай школьная ўлада доўга не дазваляла адчыняць.

Адцемім тутака, што школу ў Панізьзі ўдалося адчыніць як дзякуючы стараньням Беларускага Гаспадарскага Зьвязу так і дзякуючы энэргічнаму дамаганьню роднай школы з боку мясцовага насяленьня.

Што дзеіцца ў сьвеце?

Папескае гаспадарства.

Умоваю паміж Папежам і Італіяй утварана новае маленкае гаспадарства незалежнае пад уладаю рымскага папежа. Найвышшай сьвецкай уладаю ў гэтым гаспадарстве будзе папеж. Утварэньням гэтага гаспадарства адбудавана даўнейшае касьцельнае гаспадарства, каторае трывала ад 755 г. да 1870 г.

У першай чэцьверці XIX ст. касьцельнае гаспадарства абыймала прастор 41 тыс. кв. кілёмэтраў з насяленьням каля 3 міл. У 1860 Італьянцы зьменшылі на 2 траціны касьцельнае гаспадарства, а ў 1870 зусім яго ліквідавалі, пакідаючы папежу права экстэрыторыяльнасьці.

Эўропэйскія палітыкі прызнаюць, што ўзнаўленьне касьцельнага гаспадарства будзе мець сусьветнае значэньне, шмат павялічаючы ўплыў папежа.

Адначасна з гэтым прызнаюць, што ў сьвеце павялічацца такжа ўплывы Італіі, бо дзякуючы ёй ўзноўлена касьцельнае гаспадарства і ў яе наладжаны найпрыязьнейшыя адносіны з папескім пасадам. Дзеля таго думаюць, што ў каталікоў усяго сьвету могуць зьявіцца некаторыя сымпатыі да Італіі, асабліва гэтыя сымпатыі будуць там, дзе працуюць рымскія місыянэры. Гэтым затрывожаны некаторыя гаспадарствы, наўперад Францыя.

Бітва паміж вернікамі дзьвюх вераў.

У індыйскім месьце Бамбаі ўзьнялося крывавае ходаньне Індусаў індускай веры зь іх-жа братамі—Індусамі-мусульманамі. Каля 150 ёсьць забітых і 800 раненых. Мусульманаў у Індыі ўсяго толькі некалькі міліёнаў, а вернікаў індускай веры каля 300 міл., але мусульмане, дзякуючы асаблівасьцем сваe веры, актыўнейшыя.

Марозы.

Ня толькі сёлета вялікія марозы ў Беларусі, але імі абнята ўся Эўропа і значная часьць Азыі. У Заходняй Беларусі мароз у некаторых мясцох дахадзіў да 45 градусаў; ад марозу мерзла навет жывёла ў хлявох. У Чэхіі ў некаторых мясцох мароз даходзіў да 40 гр., у Румыніі ад 32 да 40, у Бэрліне да 29 град., таксама ў Вене. Навет мароз ёсьць у Францыі і ў вечна цёплай Італіі.

Значэньне коопэрацыі.

Коопэрацыя цяпер адыгрывае адну з галаўнейшых ролеў у гаспадарскім адраджэньні. Яна ня толькі служа вызваленьню асобных клясаў народу, (сялянства, работніцтва), але навет падыймае з галіты й заняпаду цэлыя народы, што спазьніліся ў сваім гаспадарскім развою з тых ці іншых прычынаў.

Што коопэрацыя можа падняць дабрабыт і культуру народаў навет найбяднейшых паводле свайго прыроднага багацьця у гэтым няма сумлеву.

Добрым довадам і прыкладам для гэтага будзе Данія, Фінляндзія. Гэтыя два невялічкія краі, бедныя па сваёй прыродзе, дзякуючы коопэрацыі, што праявілася ў згоднай супрацы сялян у ўсіх галінах земляробскага вытварства, скоопэратызавалі блізу што ўсё гаспадарскае жыцьцё. Дало гэта той вынік, што гэтыя краі цяпер да некаторай меры служаць прыкладам іншым. Невялічкая Данія б'е сваім заграмічным вывазам (масла, яйкі і інш.) краі многа разоў яе большыя; мае яна заўсёды дадатні гандлёвы баланс, каторага так ня могуць дапяць іншыя.

Галоўнай прычынай коопэратыўнага руху быў і ёсьць непамерна распухлы прыватны гандаль, дзякуючы чаму тавар з хвабрыкі, таксама земляробскія вырабы, мусіць ісьці да спажыўца вялікім радам драбінак прыватнага пасярэдніцтва. Вынікам гэтага падарожжа было тое, што спажывец плаціў за некатарыя тавары ўдвая, утрая болей, чымся яны былі варты.

Канкурэнцыя, што быццам запыняе даражыню,

гэт'кі: з панам пагадзіцца і за кожны морг лесу вымагаць па чатыры маргі поля на Падлесьсю.

Зьдзівіліся ўсе і вельмі ўзрадаваліся з такое магчымасьці, а Рыгор яшчэ гаманіў, што таксама згадзілася адна вёска каля Плоцка, аб чым вычытаў у газэце.

— Добра кажа, дзяцюкі! Жыдзе, гарэлкі! — крыкнуў Плошка ў дзьверы.

— За тры маргі бору якраз было-б нам двананцаць поля!

— А нам зь дзесяць, цэлая гаспадарка!

— І хай-бы дадаў крыху кустоў на апал.

— А за пасьбішчы мог-бы даць хоць па маргу сенажаці.

І крыху дзерава на будоўлю—крычэлі адзін за адным.

— Яшчэ крыху і захочаце, каб вам даў па кані з возам і па карове, што? — насьміхаўся Мацей.

— Ся! трэба цяпер намаўляць, каб гаспадары забраліся, пайшлі да пана і запрапанавалі яму чаго хочуць: можа й згодзіцца.

Мацей яго перабіў:

— Калі ня мае нажа на горле, дык ня згодзіцца: яму як га трэба грошы, і Немцы іх дадуць, хоць-бы заўтра, хай толькі згодзіцца... А пакуль нашыя надзяруцца патыліцы, пакуль нарадзяцца, пакуль на адно згодзяцца, пакуль бабы перацягнуць на свой бок, дык месяцы пройдуць, пан зямлю прадасьць і да нас плячыма адвернецца: будзе мець за што прававаца за бор. Рыгораў спосаб разумны, але мне здаецца, трэба яго з другога канца пачынаць.

— Дык кажы, Мацей, радзь!

— Не гаманіць, ня радзіцца, а трэба зрабіць так сама як з борам.

— На пару гэтак можна, а на пару не! — буркнуў Рыгор.

— А я тэ кажу, што можна, іншым крышку спосабам, але тое самое выйдзе... Да Немцаў ісьці ўсёй грамадой і супакойна заявіць, каб ня важыліся купаваць Падлесься...

— Але, яны такія дурныя, што зараз нас спалохаюцца й паслухаюць!

— Дыкжэ ім заявім, што калі не паслухаюць і купяць, дык не дазволім сялібіцца, не цамо кроку[1]) ступіць за поле. Пабачыце, што спалохаюцца! Выкурым іх, бы лісоў із ямы.

— Пэўне, быццам ня знайдуць абароны!.. дадушы, так нас ізноў за гэтыя пастрашаньні засадзяць у турму!—ускрыкнуў Рыгор.

— Калі засадзяць, то й пусьцяць, вякаваць там ня будзем, але затое, як выпусьцяць, дык Немцам будзе яшчэ гарэй... яны ня дурныя і пярвей добра падумаюць, ці ім вайна з намі пойдзе на здароўе... Пан таксама начай запяе, як яму купцоў разгонім, а ня так...

Але ўжо Рыгор ня мог вытрываць, ускочыў ад столу і пачаў з усяе сілы адводзіць ад гэтых адважных плянаў. Даводзіў, якія з гэтага вынікнуць процэсы, новыя страты ўсім, новыя шкоды, што могуць пазасаджваць іх за гэтыя заўсёдныя бунты на пару год у турму... што ўсё магчыма зрабіць супакойна із самым панам, прасіў, каб новага няшчасьця не наклікалі на народ. Гаманіў доўга, ажно пачырванеў, ажно цалаваў іх, просячы, каб пакінулі, але ўсё гэта было дарма, словы ягоныя адбіваліся ад людзёў, як гарох ад сьцяны. Напасьледак Мацей сказаў:

Гамоніш, бы ў касьцеле, як-бы з кніжкі чытаў, а нам чаго іншага трэба!

Разам усе пачалі гаманіць, зрывацца, біць кулакамі ў стол і крычэць із вялікае радасьці:

— На Немцаў пойдзем, разгонім прыблудаў! Мацей добра кажа, яго слухаем, а хто баіцца, хай пад падушку схаваецца!

Немагчыма ўжо было да іх гаманіць, так іх разабрала.

* * *

(Далей будзе).

---

*) Сігпю, „шагу“.

запраўды мала памагае, а толькі стварае грунт дзеля фальсыфікацыеў (падробу) тавараў. Фальсыфікацыя еміны бывае часта шкодліва ня толькі кішані спажыўцовай, але й ягонаму здароўю, бо прыватны гандаль у сваім пагоне за зыскам часта забываецца гэткаю „дробнаю“ рэч, як здароўе спажыўцова.

Першы спажывецкі коопэратыў (сябрына) паўстаў сярод работнікаў, нямаючых працы ткачоў места Рочдэля[1]). Зрабілі гэты важны крок спачатку ўсяго дваццацёх восемёх чалавекаў з мэтай заашчадзіць свой працоўны грош і дастаць лепшай якасьці тавар. Гэткія былі скромныя жаданьні першага коопэратыву, што радзіўся саматугам (тварцы ягоныя ня ведалі ніякіх аканаміцкіх тэорыеў) з прычыны толькі аднаго магутнага інстыкту абароны ад вызыску вольным гандлям.

Адгэнуль (было гэта ў палавіне мінулага стагодзьдзя) коопэрацыя памалу перакінулася ў усе краі Эўропы і шырака разраслася. Апрача коопэрацыі спажывецкай зрадзілася яшчэ: пазыковая, земляробская, вытворская і інш. На перадзе іх усіх—коопэрацыя спажывецкая. Яна ў многіх краёх значна выціснула прыватны гандаль і пачынае паступова захопліваць продукцыю. Добрым дзеля гэтага прыкладам можа быць і коопэрацыя спажыўцоў Польшчы, каторая (коопэрацыя) за кароткі час свайго быцьця стварыла ў цэлым краі сетку коопэратываў (хоць досыць яшчэ рэдкаю) і паступова пачынае перахадзіць да прадукцыі. Цяперака мае колькі хвабрыкаў (мыла, цукерак і інш.) млыноў і значнаю лічбу мэханічных пекарнеў.

Коопэратыўны рух у Беларусі ёсьць яшчэ даволі малады. Меў ён масавыя хвормы ў ваенны й паваенны час. Тады коопэратывы расьлі як грыбы. Рост іхні вызваны быў да некаторай меры штучна (ваенным часам), ня меў адпаведных людзёў працы. Развой іхні запыніў і ў большай часьці зьнішчыў іхнія невялікія капіталы падаючы курс грошаў. Вынікам гэтага было, што маладыя коопэратывы не маглі апанаваць гаспадарскіх труднасьцеў і большая часьць іх паўпадала.

Апошнія гады коопэратыўны рух у нас як бы стаў на мёртвым пункце. Сьведчыць аб гэтым хоць бы й той факт, што прыкладам у досьць вялікім Дзісенскім павеце ёсьць толькі чатыры слабенкія спажывецкія коопэратывы, слабы маюць размах і іншыя роды коопэрацыі; існуючыя ў некатарых мясцох коопэратывы земляробска-гандлёвыя пачынаюць губляць рысы коопэратывізму. У вапошні час многа дзе закладаюцца супалкі малачарскія, пры моцнай памозе з боку самаўрадаў.

Але гэтакае палажэньне яшчэ не даводзе, што ў Беларусі нямашака зацікаўленьня коопэрацыяй. Зацікаўленьне ёсьць і навет не малое. Беларускае сялянства пачынае разумець важнасьць кожнай галіны коопэрацыі так патрэбных земляробу як: спажывецкая, крэдытная, земляробская і інш. Малы-ж поступ коопэрацыі ў нас ёсьць вынікам спэцыфічных абставінаў жыцьця нашага краю, якія задзержуюць альбо зусім дапелняюць поступ здаровых сіл вёскі ў кірунку гаспадарскага адраджэньня.

Трэба яшчэ зазначыць, што многія коопэратывы не імкнуцца да заўсёднай супрацы із сваімі сябрамі; ня трымаюцца яны точна літары статуту, забываюцца, што коопэратыў ня толькі гандлёвае прадпрыемства, але й грамадзкая ўстанова, якая павінна гадаваць сваіх сяброў у правілах узаемнай салідарнасьці. Не выпаўненьне гэтых галоўных асноваў коопэрацыі, абходжаньне із сябрамі коопэратывы як у прыватным гандлю, безахвоціць часта навет найгарачэйшых прыхільнікаў коопэратывы.

Кожны сябра коопэратыву мусіць быць так узгадаваны, каб відзеў у коопэратыве свой собскі твор, сваё дзіцё; так сказаць (калі можна гэдак выразіцца), каб меў коопэратыўны патрыётызм.

Злучэньне беларускай спажывецкай коопэрацыі з польскай, хаця і ўтрымала ад заняпаду мацнейшыя коопэратывы, але незразумленьне яе павадыроў асаблівасьцеў развою нашага народу, нядольнасьць падыйці да вёскі із зразумелай ёй мовай было прычынай таго, як гэта было успомнена вышэй, што коопэратыўны рух стаў на мёртвым пункце.

Каб скрануць яго зь мейсца, пабудзіць да творскай працы, у яго павінны ўліцца маладыя, ідэйныя, здаровыя сілы краю, якія сваім маладым запалам зрабілі-б удзячнаю працу коопэратыўнага ўсьведамленьня ў усіх куточках вёскі.

Павінен-бы ў Вільні быць створаны ідэйны цэнтр коопэрацыі з мэтай яе папулярызацыі ў народзе, цэнтр гэтакі выпрацаваў-бы кірунак коопэратыўнага руху згодна з асаблівасьцямі краю. Дзеля ўжыцьцяўленьня гэтых мэтаў павінна быць створана коопэратыўна-пропогандыстычнае таварыства (хоць-бы нешта падобнае да фінляндзкага „Tellerwo“).

Гэтай працай павінна было-б зацікавіцца ўсё грамадзянства. Пачэсная роля ў паходзе коопэрацыі выпадае на беларускаю прэссу дзеля ўсьведамленьня насяленьня аб значэньні коопэрацыі. Павінны зразумець усе, што коопэрацыя і толькі коопэрацыя, як згодная супраца ўсяго народу, аддаляючая непатрэбныя шкодныя часьці грамадзкага арганізму, творачая новыя роды сужыцьця, аддаліць насьпяваючыя антаганізмы клясаў цяперашняга грамадзянства і створыць новаю эру ў жыцьці людзтва—эру коопэратывізму.

А. Ар.

Вільня, 15—XII—28 г.

Дзівосы й сьмяхоты.

Дварчаніну Бацькаўшчыны ня трэба.

Лекцыю сваю 18. XI. 28. І. Дварчанін скончыў лёзунгам: „Няхай жыве ня Бацькаўшчына, а народ!“.

„Народ“ не адноўчы пісаў, што Дварчанін і ўся ягоная дабраная кумпаня—інтэрнацыяналістыя, што ім ня дорага нашая Бацькаўшчына і беларуская справа. Дварчанін у розных „Працах“ запіраўся, пісаў, што наш часапіс выдумляе, каб скопрамітаваць яго у вачох народу, але такімі лёзунгамі—як і ўсёй работай—ён дыкжэ сам даводзе сваю інтэрнацыяналістычнасьць.

Што такое Бацькаўшчына?

Бацькаўшчына — гэта зямля, заселеная здаўна народам. Хто ня зыча Бацькаўшчыне дабра, хто ня хоча, каб народ сам гаспадарыў на сваёй зямлі (Бацькаўшчыне), той ня можа жадаць дабра і самому народу. І запраўды, народ для інтэрнацыяналістых „няхай жыве“ толькі на тое, каб рабіць зь ім розныя экспэрымэнты (пробы), а Бацькаўшчынай, зямлёй ягонай інтэрнацыяналістыя ня цікавяцца, няхай сабе яе забіраюць польскія або жыдоўскія асаднікі.

Панове інтэрнацыяналістыя, ці ня порана вы адкрываеце сваё аблічча, гэта-ж народ пагоне вас кольлям ад сябе?!

Кр. Асва.

Прачытаўшы, не зьністажай, але дай прачытаць другому.

Што пішуць аб Крывічох (Беларусах).

„Аб беларускай інтэлігенцыі“. „Życie Nowogródzkie“ выдаванае Наваградзкім вайводзтвам, надрукавала ў „Вольнай трыбуне“ сьцяг артыкулаў розных аўтараў на тэму „Аб інтэлігенцыі беларускай“. Побач із паглядамі сур'ёзнымі знаходзім тутака такжа наіўныя й неадпавядаючыя праўдзе. Ня шкодзіла-б, каб і прадстаўнікі сьвядомае беларускае інтэлігенцыі прынялі ўчасьце ў гэтым дыспуце.

„Дыялекты беларускага языка“. У № 5 часапісу „Sprawy Narodowościowe“ выдаванага польскім „Інстытутам Дасьледаваньня Нацыянальных Справаў“ (Варшава, Ясна 19), д-р Я. Станкевіч надрукаваў пад вышменаваным назовам вялізнаю (звыш 10-ёх старонак) стацьцю. У стацьці паказаны падзел беларускае мовы на нарэччы і пададзеныя граніцы беларускае мовы.

Браты Беларусы, пашырайце сваю беларускаю газэту „НАРОД“!

Свая пошта.

— Рыгору Семашкевічу—адрэс перамянаем.

— Леаніду Глышку, Рыгору Патурбэйку, Стэфану Воўкаву, Станіславу Барсуку, Паўлу Кабаку, Літоўскаму Навуковаму Т-ву. Э. Карпенюку і Яну Башаркевічу—газэту пасылаем. Ад Т. Браўковіча—27 зл. дасталі, па 3 экзэмпляры газэты пасылаем.

Ад Я. Забелы—2 зл. дасталі, газэту пасылаем.

Выдавецтва Беларускае Сялянскае Партыі. Вільня, Друкарня „РАХ“, Сьвята-Ігнатаўская вул. №5. Рэдактар Б. Станкевіч.